# Палітычныя правы шляхты
# Вялікага Княства Літоўскага

*Станкевіч В. С., студ. II к. БДУ,*
*навук. кір. праф. Доўнар Т. І., д-р юрыд. навук*

Саслоўе шляхты, працэс фарміравання якога адбываўся на працягу XIV–XVI стст., заняло пануючае становішча ў палітычным жыцці Вялікага Княства Літоўскага. У канцы XVI ст. шляхта набыла статус палітычнай эліты ў дзяржаве. Гэта было заканадаўча афармлена агульназемскімі прывілеямі, а затым Статутамі 1529, 1566, 1588 гг., Генрыхавымі артыкуламі, Пакта Канвента і іншымі нарматыўнымі актамі.

Самымі важнымі былі палітычныя правы шляхты. Так, яна мела права ўдзельнічаць у павятовых сойміках і праз сваіх прадстаўнікоў – у вальных соймах, на якіх вырашаліся важныя дзяржаўныя пытанні [1]. Упершыню гэта права згадваецца ў прывілеях 1560-х гг., а канчаткова юрыдычна замацавана ў Статутах Вялікага Княства Літоўскага. Нормы Статута 1529 г. паставілі шляхту на вызначальнае, адасоблена прывілеяванае месца ў дзяржаве [2, с. 111]. У Статуце ж 1566 г. гаварылася: «уставуемъ для лепшого порадку во речахъ и въ способу ку справедливости и обороне, абы за волею всехъ на соймикахъ потребы се земкіе становили и отправованы были» [3, с. 79]. Збіраўшыся на сойміках, шляхта не толькі абмяркоўвала бягучыя пытанні павета, але выбірала паслоў на вальны сойм, кандыдатаў на пасады ў земскія і падкаморскія суды і суддзяў у Галоўны трыбунал [4, с. 524]. Сойм павінен быў склікацца па ініцыятыве паноў радных і шляхты: «ижъ маемъ мы и потомки наши Великіе Князи Литовскіе съ потребы Речы Посполитое за радою радъ нашихъ того жъ панства, або за прозбою рыцерства, складати сеймы вальные» [3, с. 80].

Далейшае адлюстраванне палітычныя правы шляхты знайшлі ў Статуце 1588 г., які не толькі ўдакладняў дзейнасць сойма і соймікаў, але і замацаваў статус сойма як вышэйшага заканадаўчага органа дзяржавы [5].

Правы шляхты павялічваліся. У выпадках, калі шляхта была незадаволена рашэннямі сойма, дэпутаты маглі выкарыстоўваць права свабоднай забароны (ліберум вета). Як правіла, яно выражалася ў выкрыку дэпутата «не дазваляем» або «пратэстуем», што вяло да адмены рашэнняў сойма і спынення яго пасяджэння [1].

Шляхта карысталася выключным становішчам у дачыненні да дзяржаўных пасад, бо толькі асобы шляхецкага паходжання мелі права займаць дзяржаўныя, адміністрацыйныя і судовыя пасады ў Вялікім Княстве Літоўскім [4, с. 525]. Закон забараняў самавольна прысвойваць шляхецкае званне і павышаць простых людзей над шляхтай. Так, у Статуце 1566 г. гаварылася: «простыхъ людей надъ шляхту не повышати, на достойности ихъ прекладати и врядовъ нашихъ простымъ людемъ давати не маемъ» [3, с. 84].

З утварэннем Рэчы Паспалітай у прававым становішчы шляхты адбыліся некаторыя змены. Час бескаралеўя прынёс з сабой пашырэнне шляхецкіх правоў [4, с. 524]. У такіх выпадках вярхоўная ўлада ў Вялікім Княстве Літоўскім да абрання новага караля пераходзіла ў рукі шляхты і менавіта яна ў гэты перыяд валодала дзяржаўным суверэнітэтам [6, с. 26]. Згодна з Генрыхавымі артыкуламі і Пакта Канвента шляхта валодала не толькі правам роўнасці перад законам і судом, недатыкальнасцю асобы і свайго маёнтка, але і правам выбару манарха, прадстаўніцтвам на вальным сойме Рэчы Паспалітай, а самае значнае – правам абараняць свае інтарэсы шляхам склікання канфедэрацый і рокашаў.

Паступова ў дзяржаве, дзякуючы нарматыўным актам (Статутам 1529, 1566, 1588 гг., Генрыхавым артыкулам, Пакта Канвента і інш.), а таксама практыцы шляхецкай палітычнай дзейнасці, сфарміравалася ідэалагічная дактрына залатой шляхецкай вольнасці, якая пасля пастановы сойма 1768 г. была замацавана ў выглядзе Кардынальных правоў – сістэме фундаментальных прынцыпаў дзяржаўнай улады Рэчы Паспалітай. Усё гэта сведчыць аб канчатковым афармленні палітычных правоў шляхты і набыцці ёю неабмежаванай улады ў дзяржаве.

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што палітычныя правы шляхты рэгламентаваліся значнай колькасцю нарматыўных актаў, якія адлюстравалі прывілеяваны статус шляхецкага саслоўя. Дадзеныя правы абмяжоўвалі ўладу манарха, адкрывалі шляхце дарогу да ўсіх дзяржаўных пасад і заканадаўчай дзейнасці, дазвалялі ёй часам умешвацца не толькі ў пытанні ўнутранай і знешняй палітыкі, але і вырашаць далейшы лёс дзяржавы.

## Літаратура

1. Доўнар, Т. І. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : падручнік / Т. І. Доўнар. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2014. – 416 с.

2. Лойка, П. А. Афармленне шляхецкага саслоўя ў Вялікім Княстве Літоўскім / А. П. Лойка // Працы гістарычнага факультэта БДУ : навук. зб., вып. 5 ; рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2010. – С. 102–115.

3. Статут Вялікага Княства Літоўскага 1566 года / Т. І. Доўнар, У. М. Сатолін, Я. А. Юхо ; рэдкал.: Т. І. Доўнар [і інш.]. – Мінск : Тэсей, 2003. – 352 с.

4. Лаппо, И. И. Великое княжество Литовское во второй половине XVI века. Литовско-Русский повет и его сеймик / И. И. Лаппо. – Юрьев, 1911. – 624 с.

5. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 года : Тэксты. Даведнік. Каментарыі. – Мн. : БелСЭ. – 1989. – 573 с.

6. Падалінскі, У. А. Барацьба шляхты за суверэнітэт ВКЛ пасля Люблінскай уніі 1569 г. / У. А. Падалінскі // Беларускі гістарычны часопіс. – 2016. – № 7. – С. 23–28.